УДК 903(091)

# АБ ПОШУКАХ МАМАНТАВАЙ ФАУНЫ К. М. ПАЛІКАРПОВІЧАМ У ДАВАЕННЫ ЧАС

*Т. В. Чараднічэнка* (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. *А. Р. Агееў*,
канд. гіст. навук, дацэнт

Канстанцін Міхайлавіч Палікарповіч карыстаўся звесткамі з апросных лістоў, складзеных І.А. Сербавым, аб знаходках рэшткаў мамантавай фаўны у сваёй навуковай дзейнасці [1, с. 167]. Ён рабіў агляд месц з такімі знаходкамі на працягу 1925–1930 гадоў. Вынікам навуковай паісковай дзейнасці стала адкрыцце дзвюх палеалетычных стаянак.

К.М. Палікарповічам 9 жніўня 1926 года была адкрыта Бердыжская стаянка. Пад час разведак па правым беразе ракі Сож былі знойдзены фрагментарныя рэшткі мамантавых зубоў [2, с. 28]. Акрамя 1926 года, Канстанцін Міхайлавіч працаваў тут з 1928 года па 1929 г. і з 1938 г. па 1939 г., але не адзін, а з такімі навукоўцамі, як Пётр Пятровіч Яфіменка і Глеб Анатолевіч Бонч-Асмалоўскі [2, с. 32].

Каля в. Юравічы, што ў Калінкавіцкам раёне Гомельскай вобласці, К.М. Палікарповічам 6 ліпеня 1929 года былі знойдзены костныя рэшткі палеалетычных жывёлаў. Вынікам даваенных раскопак сталі косткі 15–20 мамантаў (па большай частцы біўні і костныя рэшткі) [2, с. 23–24].

Канстанцін Міхайлавіч задаўся мэтай стварыць зводку ўсіх здабытых звестак і таксама дадаць да гэтага спісу адпаведныя карты. У сваёй працы «Знахадкі рэштак чацьвярцёвай фаўны на тэрыторыі БССР»



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

1932 г. ён склаў спіс усіх вядомых на той момант знаходак рэштак прадстаўнікоў маматавай мегафауны, сабраў звесткі аб 129 пунках знаходжання рэшткаў палсафауны [1, с. 168].

Канстанцін Міхайлавіч Палікарповіч з'яўляецца менавіта тым чалавекам, з імем якога справядліва звязваюць даваеннае вывучэнне палеалетычных комплексаў. Ён першым з тагачасных навукоўцаў сістэмазаваў і склаў спіс усіх вядомых месц знаходжання рэштак мамантавай фаўны.

## Літаратура


1. Палікарповіч, К.М. Знаходкі рэштак чацьвярцёвай фауны на тэрыторыі БССР : в 5 т. / К.М. Палікарповіч // Працы секцыі археалогіі АН БССР. – Мінск, 1932. – Т.3. – С. 167–185.

2. Калечыц, А.Г. Палеалітычныя помнікі Беларусі: (культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя крыніц) / А.Г. Калечыц, А.У. Коласаў, В.С. Абухоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 323 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова